УДК 37.018.12

**Т. У. Жукоўская**, выкладчык (БДТУ)

# ПЕДАГАГІЧНАЯ КУЛЬТУРА БАЦЬКОЎ ЯК ЧАСТКА АГУЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ ЧАЛАВЕКА

У прапануемай публікацыі на аснове аналізу існуючых у навуцы падыходаў удакладняецца паняцце «педагагічная культура бацькоў». Вызначаны і ахарактарызаваны яе структурныя кампаненты і ўзроўні сфарміраванасці.

Адным з тактычных падыходаў у вырашэнні супярэчнасцей паміж узроўнем адукаванасці бацькоў, якая значна ўзрасла ў апошні перыяд, і невысокім узроўнем іх кампетэнтнасці ў разуменні мэт, задач, зместу і метадаў сямейнага выхавання можа стаць выкарыстанне актыўных метадаў у працэсе фарміравання педагагічнай культуры бацькоў.

In this article we specify the notion «pedagogical culture of parents» on basis of the analysis of the existed approaches in science, we also define and characterize its structural components and levels of formation.

One of the tactical approaches in solving the contradiction between the increased level of parents' scholarship and the low level of their competence in understanding the goals, tasks, meaning and methods of family upbringing, may become the usage of active methods in the process of forming the parents' pedagogical culture.

**Уводзіны.** У апошнія гады эканамічная і палітычная сітуацыя ў грамадстве даволі рэзка змянілася і гэта істотным чынам паўплывала на функцыі сям'і як сацыяльнага інстытута. Сямейныя адносіны перажываюць крызіс. Адукацыйныя магчымасці, якія ўзраслі таксама ў апошні час, не садзейнічаюць павышэнню кампетэнтнасці бацькоў у пытаннях выхавання. Мы ўсё часцей назіраем у студэнцкай моладзі бескультур'е, хамства, цынізм, абыякавасць, брыдкаслоўе і іншыя негатыўныя з'явы. Усім вядома, што аснова выхавання, культура паводзін маладога чалавека заўсёды закладваліся ў сям'і, залежылі ад культуры бацькоў. Таму сучасныя сацыякультурныя ўмовы дыктуюць неабходнасць па-новаму асэнсаваць праблему культуры бацькоў.

Старажытнейшы выхаваўчы інстытут, сям'я, на працягу многіх стагоддзяў быў адзінай формай падрыхтоўкі маладых людзей да жыцця і працы. І сёння вядучая роля сям'і ў выхаванні моладзі прызнана сусветным грамадствам, зафіксавана ў шэрагу міжнародных дакументаў, у тым ліку ў Канвенцыі па правах дзіцяці. Сям'я разглядаецца як першы і ў ідэале апошні рубеж аховы дзяцей [1].

**Асноўная частка.** Ва ўмовах эканамічнага і палітычнага рэфармавання грамадства адбылася пераацэнка культурных і сацыяльных каштоўнасцей, норм і адносін. Усё гэта не магло не закрануць сям'ю як сацыяльны і выхаваўчы інстытут. Сям'я сутыкнулася з новымі праблемамі: супярэчнасць паміж маладзёжнай субкультурай і каштоўнасцямі «дарослай» культуры; барацьба бацькоў за «выжыванне» і абумоўленыя гэтым бескантрольнасць і ўсёдазволенасць дзяцей; даступнасць для непаўналетніх алкаголю, наркотыкаў, тытунёвых вырабаў, азартных гульняў і г. д.; пагаршэнне псіхалагічнага стану падлеткаў (неўрозы, юнацкі суіцыд і спробы да яго, комплексы непаўнавартасці); рост агульнаадукацыйнага ўзроўню бацькоў і адначасова нізкі ўзровень педагагічнай культуры; зніжэнне аўтарытэту навучальных устаноў. У выніку многія сучасныя бацькі аказаліся не гатовымі да выканання сваёй асноўнай функцыі – выхаваўчай. У гэтым сэнсе выключна важнае значэнне мае авалоданне бацькамі спецыфічнымі ведамі і навыкамі выхавання, што многія навукоўцы трактуюць як **педагагічная культура** [2].

Немагчыма вызначыць сутнасць паняцця «педагагічная культура бацькоў» без разгляду тэрміна «культура». Культура – з'ява складаная, таму ёй аддаюць шмат увагі шэраг навук: філасофія, сацыялогія, культуралогія, эстэтыка і г. д. Па звестках ЮНЕСКА, існуе звыш 600 розных азначэнняў таго, што можна назваць культурай.

Слова культура (*cultura*) лацінскага паходжання, што ў першапачатковым значэнні – апрацоўка і догляд зямлі, каб зрабіць яе прыгоднай для задавальнення чалавечых патрэб [3]. Калі ж чалавек пачаў выдзяляць сябе з прыроды, да яго прыйшло разуменне значнасці ўласнай актыўнасці, арыентаванай не толькі на вытворчасць матэрыяльных каштоўнасцей, але і духоўных, на ўдасканаленне яго здольнасцей, абагачэнне яго духоўнасці [4].

У слоўніку «Семейное воспитание» педагагічная культура бацькоў разглядаецца як «составная часть общей культуры человека, в которой воплощен накопленный человечеством опыт воспитания детей в семье и которая служит основой собственно педагогической деятельности отца и матери, помогает им избегать традиционных ошибок в семейном воспитании

и находить верные решения в нестандартных ситуациях» [1].

Прадстаўнікі педагагічнай навукі пры вывучэнні педагагічнай культуры як спецыфічнай асаблівасці бацькоў трактуюць гэта наступным чынам: І. В. Грабеннікаў разглядае дадзенае паняцце як педагагічную культурнасць бацькоў, г. зн. «совокупность уровней педагогической подготовленности и развития определенных качеств отцов и матерей, отражающихся в процессе деятельности по семейному и общественному воспитанию» [5]; В. В. Чэчэт лічыць, што гэта не толькі педагагічная падрыхтаванасць, але і «зрелость родителей как воспитателей, которая дает реальные положительные результаты в процессе семейного и общественного воспитания детей, опыт воспитания детей в семье, приобретенный разными категориями родителей непосредственно в своей стране, других странах, а также взятый из народной семейной педагогики» [6]. Як уменне аналізаваць, планаваць, арганізоўваць выхаваўчую дзейнасць, ствараць пэўны стыль і тон адносін разглядае дадзенае паняцце Л. І. Малянкова [7]. Навуковец Т. А. Кулікова педагагічную культуру азначае як «компонент общей культуры человека, в котором находит отражение накопленный предыдущими поколениями и непрерывно обогащающийся опыт воспитания детей в семье» [5].

Навукоўцы лічаць, што крытэрыямі сфарміраванасці педагагічнай культуры бацькоў з'яўляюцца: усведамленне мэт і задач выхавання дзяцей у сям'і; усведамленне ролі педагагічных, псіхалагічных, медыцынскіх, прававых ведаў у выхаванні; назапашванне ведаў і вопыту выхавання дзяцей у сям'і; усведамленне ролі спрыяльнага сямейнага маральна-псіхалагічнага клімату ў выхаванні дзяцей; факт рэфлексіі. Педагагічная культура бацькоў мае складаную структуру і ўяўляе сабой адзінства матывацыйнага (аўтарытэтнасць, нацэленасць), інтэлектуальнага (педагагічная эрудыцыя, прагназаванне), эмацыйна-валявога (настойлівасць, цярпенне, прынцыповасць, самавалоданне), дзейсна-практычнага (педагагічная самаадукацыя, кансультаванне), экзістэнцыяльнага (экзістэнцыя – унутранае быццё чалавека, яго непаўторнасць, індывідуальнасць) (самаацэнка, самааналіз, самавыхаванне) кампанентаў.

Існуюць розныя ўзроўні сфарміраванасці педагагічнай культуры бацькоў. Паказчыкамі высокага ўзроўню з'яўляюцца: імкненне авалодаць вопытам выхавання дзяцей у сям'і; нацэленасць на дасягненне станоўчых вынікаў выхавання; імкненне заваяваць станоўчы бацькоўскі аўтарытэт; жаданне быць добрым бацькам, маці, прыкладам для ўласнага дзіцяці; веданне асноў педагогікі, псіхалогіі, фізіялогіі, медыцыны; веданне ўзроставых і індывідуальных асаблівасцей дзіцяці; перажыванне разам з дзіцяці яго праблем, няўдач, радасцей, дасягненняў; уменне валодаць сабой ва ўзаемаадносінах з дзіцяці; настойлівасць, цярпенне ў дасягненні мэт выхавання; сувязь з выхавальнікамі, настаўнікамі, выкладчыкамі, псіхолагамі; уменне находзіць кампраміс і г. д.

Сярэдні ўзровень характарызуецца невысокай зацікаўленасцю навінамі ў галіне выхавання і адукацыі, усведамленнем мэт і задач выхавання без уліку ўзроставых і індывідуальных асаблівасцей дзіцяці, аднастайнасцю метадаў і сродкаў выхавання, адмаўленнем вопыту выхавання папярэдніх пакаленняў, недастатковым узаемадзеяннем з вучэбна-выхаваўчымі ўстановамі.

Бацькі з нізкім ўзроўнем педагагічнай культуры не маюць дастатковых ведаў па педагогіцы і псіхалогіі, не толькі ўсведамляюць мэт і задач выхавання, у спрэчных педагагічных сітуацыях не могуць знайсці кампраміс, у адмоўных выніках выхавання бачаць віну толькі вучэбна-выхаваўчых устаноў, сродкаў масавай інфармацыі, не ўмеюць упраўляць сваім эмацыйна-псіхалагічным станам, пастаянна канфліктуюць з дзецьмі. У выніку ўсё гэта прыводзіць да выхаваўчых памылак.

Думаецца, што ў сучасных умовах, калі значна ўзрос адукацыйны ўзровень бацькоў, неабходна як мага больш ствараць умоў для рэалізацыі патрэб бацькоў у іх самаразвіцці і самаадукацыі. Кантакт педагогаў, псіхолагаў з бацькамі павінен насіць не толькі інфармацыйны характар, а мець актыўнае ўзаемадзеянне з выкарыстаннем разнастайных метадаў праблемнага і развіваючага навучання і выхавання. Актыўныя метады забяспечаць актывізацыю разумовай дзейнасці бацькоў, пастаяннае іх далучэнне да працэсу ўзаемадзеяння школы, інстытута, універсітэта і сям'і; павышаную ступень матывацыі; высокі эмацыйны ўзровень, рэфлексіўную актыўнасць.

Асноўны прынцып эфектыўнага педагагічнага сродку зносін – гэта прынцып «не нашкодзь». У медыцынскай практыцы ёсць паняцце «ястрагенія» [8]. Так называюць неспрыяльныя змены ў псіхіцы пацыента, якія выкліка
ны памылкамі ўрача падчас зносін з хворым: як сказаў, што сказаў, якім тонам, як паглядзеў. У педагагічнай практыцы таксама ёсць такое ж паняцце – «дыдактагенія» [8]. Гэта негатыўны псіхічны стан навучэнца, які выкліканы парушэннем педагагічнага такту з боку выхавальніка (настаўніка, выкладчыка, трэнера, бацькоў). Вокрык, пагроза, абраза, запужванне з боку выкладчыка, выхавальніка, бацькі фарміруе ў

маладога чалавека павышаную эмацыйна-асобасную залежнасць, недахоп самастойнасці, няўпэненасць ў сабе, нерашучасць, пачуццё пастаяннай незадаволенасці, упартасць. З другога боку, паблажлівасць, усёдаравальны стыль у выхаваўчым і навучальным працэсе таксама недапушчальны, бо перашкаджае дзіцяці, навучэнцу выпрацоўваць пачуццё самакантролю і стварае неспрыяльныя ўмовы для засваення ведаў. У асяродку бацькоў, настаўнікаў распаўсюджана памылковая думка, што чым больш паблажліва яны адносяцца да маладога чалавека, тым спрыяльней выглядаюць у яго вачах. Але, як ні дзіўна, дзецям, навучэнцам больш падабаецца ўмераная строгасць, бо паблажлівасць яны расцэньваюць як прыкмету слабасці, бесхарактарнасці. Таму бацькі, выкладчыкі павінны ўмела спалучаць строгасць і патрабавальнасць з добразычлівымі адносінамі да дзяцей, навучэнцаў.

Немалаважным фактарам, які неабходна ўлічваць кожнаму выхавальніку, з'яўляецца ўзаемадзеянне дзіцяці, падлетка з сацыяльным акружэннем. Гэты кантакт носіць складаны і ў многім канфліктны характар. Вядома, што для падлетка кантакт з аднагодкамі з'яўляецца найбольш значным. Разам з тым гэтыя суадносіны і найбольш канфліктагенныя. Сваркі з равеснікамі, непрыманне з іх боку парушае душэўную раўнавагу падлетка. А калі яшчэ сітуацыя ўзмацняецца канфліктам з бацькамі, якія не разумеюць прычын рэзкасці, раздражняльнасці, грубасці ў паводзінах сына ці дачкі, то ў падлетка можа ўзнікнуць пачуццё загнанасці, жыццёвага тупіка. Таму вельмі важна бацькам умець дакладна і своечасова рэагаваць на крытычныя жыццёвыя сітуацыі. Трэба зазначыць, што адным з асноўных правіл паспяховых педагагічных зносін з'яўляецца: «Гаварыць пра сітуацыі, а не пра асобу і яе характар». Яно спраўджваецца пры любых непаразуменнях, якія ўзнікаюць паміж бацькамі і маладым чалавекам. Прывядзем прыклад: навучэнец разліў фарбы. Звяртаючыся да сітуацыі, настаўнік скажа: «Я бачу, хтосьці разліў фарбу. Нам патрэбна вада іануча», а звяртаючыся да характару дзіцяці: «Ты такі нехлямяжны. Чаму ты такі нядбалы?»

Немалаважным фактарам узаемаадносін бацькоў і дзяцей з'яўляецца небяспека пахвалы. Уплыў пахвалы будзе дабратворным, калі бацькі ацэньваюць намаганні і дасягненні дзіцяці, а не яго характар. Прадуктыўная пахвала павінна грунтавацца на рэалістычным, аб'ектыўным апісанні дзеянняў дзіцяці. Трэба адзначыць, што пахвала не павінна ўтрымліваць параўнання поспехаў, вынікаў або асобасных якасцей дзіцяці з дасягненнямі равеснікаў. Пахвала-параўнанне не спрыяе фарміраванню пачуцця самаацэнкі, самаўспрымання асобы, стварае ўмовы для фарміравання ў яе негатыўнай установкі і зайздрасці ў адносінах да больш удачлівага равесніка.

Эфектыўнасць педагагічных намаганняў бацькоў будзе толькі ўзрастаць, калі яны пастаянна будуць падкрэсліваць сваю павагу да дзяцей. Прытрымліванне правіла ветлівасці дазволіць бацькам у любой сітуацыі заставацца на даволі высокім узроўні культуры і падымаць да яго маладых людзей.

**Заключэнне.** Такім чынам мы разглядаем педагагічную культуру бацькоў як частку агульнай культуры чалавека, якая ўключае вопыт выхавання дзяцей, падлеткаў у сям'і, назапашаны папярэднім пакаленнем, спецыяльна набытыя псіхолага-педагагічныя веды і ўменні, якія свядома прымяняюцца ў працэсе сямейнага і грамадскага выхавання падрастаючага пакалення, а таксама працэс пастаяннага самаўдасканалення як асобы і выхавальніка.

## Літаратура


1. Семейное воспитание: краткий словарь / сост. И. В. Гребенников, Л. В. Ковинько. – М.: Политиздат, 1990. – С. 121, 179.
2. Гребенников, И. В. Повышение педагогической культуры родителей как основа совершенствования семейного воспитания школьников: учеб. пособие / И. В. Гребенников. – М.: Просвещение, 1991. – С. 10, 16.
3. Философский энциклопедический словарь. – М.: ИНФРА-М, 1997. – С. 229.
4. Роль культуры в формировании личности / Е. М. Бабосов [и др.]; науч. ред. Е. М. Бабосов. – Минск: Наука и техника, 1980. – С. 192.
5. Куликова, Т. А. Семейная педагогика и домашнее воспитание: учебник / Т. А. Куликова. – 2-е изд., испр. и доп. – М.: Академия, 2000. – С. 170.
6. Чечет, В. В. Педагогика семейного воспитания: учеб. пособие / В. В. Чечет. – Мозырь: ООО ИД «Белый Ветер», 2003. – С. 214.
7. Маленкова, Л. И. Теория и методика воспитания: учеб. пособие / Л. И. Маленкова. – М.: Педагогическое общество России, 2002. – С. 182.
8. Булыка, А. М. Слоўнік іншамоўных слоў: у 2 т. / А. М. Булыка. – Мінск: БелЭн, 1999. – Т. 1: А–Л. – С. 434; Т. 2: М–Я. – С. 735.


*Пастуціла 30.05.2011*